ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 102 (1371) ЧАЦЬВЕР, 7-га мая 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 60 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

9 мая г. г., а 8 гадзіне ўвечары, у памяшканьні клюбу харчавікоў імя Сталіна (рог Комсамольскай і Інтэрнацыянальнай)

адбудзецца **УРАЧЫСТАЕ ПАСЕДЖАНЬНЕ**

бюро ЦК, Менгаркому ЛКСМБ і рэдакцыі „Чырвонай зьмены“ з удзелам актыву гарадзкой комсамольскай організацыі, **ПРЫСЬВЕЧАНАЕ**

10-цігадоваму юбілею „Чырвонай Зьмены“.

З дакладам аб 10-цігадовым юбілеі „Чырвонай Зьмены“ выступае рэдактар „Ч. З.“ тав. Платаў М.

Пасьля ўрачыстага паседжаньня — **мастацкая частка.** Білеты на ўваход у гаркоме ЛКСМБ.

АБАВЯЗВАЕМСЯ

Да гэтага часу мы дрэнна кіравалі, вельмі дрэнна вялі палітыка-выхаваўчую і масавую работу сярод рабселькораў і юнкораў-ударнікаў.

Падкрэсьліваючы гэта ў сваім рашэньні, ЦК КП(б)Б з 20-мая 1931 г. абвясьціў месячнік пролетарскага друку.

Месячнік павінен за ўсёй паўнатой выявіць наколькі наш цэнтральны і раённы друк па-бальшавіцку змагаецца за генеральную лінію партыі і выконвае ролю організатара. „Наколькі пасьпяхова ўвесь друк змагаецца за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, за гаспадарчы разрахунак, адзінаначальле, авалоданьне тэхнікай сваёй справы, за скарачэньне тэрмінаў сяўбы, пераход колгасаў на зьдзельшчыну, падрыхтоўку да ўборачнай кампаніі, за ўздым новай магутнай хвалі колгаснага прыліву.“

Задачы месячніка павінны быць органічна ўвязаны з задачамі ўзмацненьня нізавога друку і рабселькораўскага руху; органічна ўвязаны з практычным ажыцьцяўленьнем рашэньняў ЦК УсеКП(б) аб перабудове рабселькораўскага руху і аб умацненьні раённага нізавога друку.

У выніку месячніка ў рады рабселькораў павінны ўліцца новыя тысячы рабселькораў і юнкораў-ударнікаў, ствараецца новыя сотні ўдарных рабселькораўскіх брыгад, якія зьяўляюцца вядучым зьвяном рабселькораўскага руху.

У сёньняшнім нумары „Чырвонай Зьмены“ мы зьмяшчаем у скарочаным выглядзе ліст менскіх ударнікаў „Праўды“.

У гэтым лісьце ўдарнікі друку выстаўляюць 15 конкрэтных прапаноў.

Трэба, каб гэты ліст быў абгавораны на рэдакцыйных нарадах усіх цэнтральных і раённых газэт, сярод рабочых і колгасьнікаў.

У адказ на прапанову ўдарнікаў „Праўды“ кожны колгас, кожнае прадпрыемства, раённыя і цэнтральныя газэты павінны выставіць сустрэчныя пляны конкрэтных абавязацельстваў.

З свайго боку, рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмена“, у адказ ударнікам „Праўды“ і ў адзнаку 10-цігадовага юбілею газэты, абавязваецца:

Да 1-га жніўня г. г. падрыхтаваць аднаго рэдактара раённых газэт.

У працягу месячніка друку завербаваць 500 новых юнкораў ударнікаў і стварыць 150 ударных брыгад.

Да 1-га чэрвеня сумесна з ЦК ЛКСМБ скончыць вылучэньне 50 комсамольцаў-актывістых для работы ў раённых газэтах, забясьпечыўшы пры гэтым максымальна высокі клясны адбор.

Нашаму прыкладу выклікаем насьледваць газэты: „Колгасьнік Беларусі“, „Юнгер арбэйтэр“ і ўсе друкаваныя раённыя газэты.



Хронамэтраж—на службу калектывізацыі

Выкарыстаць вопыт комсамольцаў-рацыяналізатараў хронометражыстых колгасу „Гігант“

Сёньня мы друкуем вопыт хронометражаваньня работы ў колгасе „Гігант“ імя „Комсомольская Правда“ (Украіна). У гэтым колгасе комсамольская організацыя дабілася, пасьля правядзеньня хронометражаваньня работы, вялізарных вынікаў: скараціліся тэрміны севу, узьнялася вытворчасьць працы.

У некаторых галінах вытворчасьці, прадукцыйнасьць працы ўзьнялася з 25 да 75 пр.

Дзякуючы хронометражаваньню работы, рацыяналізатарскі гурток комсамольцаў яскрава бачыў прычыны адставаньня ў працы таго ці іншага вучастку, своечасова выкрываў прычыны нізкай вытворчасьці працы і зараз-жа мобілізоўваў увагу колгасьнікаў на ліквідацыю гэтых „слабых“ месц у працы.

Рацыяналізатарскі гурток, абгаварыўшы на сваёй нарадзе хронометраж работы ў колгасе, выносіў практычныя прапановы, якія потым абгаварваў агульны сход колгасьнікаў. Зацьверджаныя сходам прапановы праводзіліся ў жыцьцё.

Улічваючы вялікую ролю хронометражу работы колгаснае вытворчасьці ў барацьбе за высокую продукцыйнасьць працы, за ўздым працоўнай дысцыпліны, за скарочаныя тэрміны сяўбы, комсамольскія ячэйкі колгасаў павінны зараз-жа разгарнуць шырокі рух за хронометраж работы. Трэба дабіцца, каб у кожным колгасе былі гурткі рацыяналізатараў-хронометражыстых.

Комсамольская організацыя Беларусі павінна выкарыстаць вопыт комсамольцаў колгасу „Гігант“.

З мэтай практычна дапамагчы комсамольскім ячэйкам разгарнуць гэту работу, газэта „Чырвоная Зьмена“, разам з комсамольскай ячэйкай колгасу „Бязбожнік“ (Лёзьненскага раёну) у бліжэйшы час падасьць хронометраж работы колгасу трактароў.

Комсамольскім камітэтам і ячэйкам трэба шырока популярызаваць сярод комсамольцаў, моладзі і колгасьнікаў задачы разгортваньня хронометражаваньня колгаснай работы, як сродкаў узьняцьця продукцыйнасьці працы, і праз газэту „Чырвоная Зьмена“ шырока популярызаваць свае практычныя мерапрыемствы і дасягненьні ў хронометражаваньні работы колгасу.

Хронометраж у колгаснай вытворчасьці

Каб ажыцьцявіць рацыяналізатарскія мерапрыемствы ў працэсе колгаснай вытворчасьці, комсамольская ячэйка організавала гурток рацыяналізатараў.

За кароткі час свайго існаваньня (2 тыдні) гурток здолеў зрабіць вялізарную работу, дасягнуць найвялікшых посьпехаў.

Ён узяўся хронометражаваць работу брыгад, вывучыць прычыны амортызацыі, паломкі машын, працаваць вакол пытаньняў лепшай організацыі колгаснай вытворчасьці.


У час севу кіраўнік гуртка рацыяналізатараў, з гадзіньнікам у руках, з дакладнасьцю да аднае хвіліны падлічыў работу і бязьдзейнасьць 21-й брыгады. Вось што ён потым падаў на гурток, бюро і агульны сход.

Падніманіся колгасьнікі а 5 гадзіне раніцы.

Зьбіраліся тры гадзіны: шукалі збрую, запрагалі коняй.

Выехалі ў поле а 8-й гадзіне раніцы.

1 гадзіну 30 хв. ехалі да месца работы—7 клм. . 9 г. 30 хв.
50 хв. засыпалі ў сеялкі насеньне і супэрфосфат . 10 г. 20 хв.
40 хв. сеялі . . 11 г. —
19 хв. насыпалі насеньня і супэрфосфат . . 11 г. 19 хв.
15 хв. сеялі . . 11 г. 34 хв.
17 хв. лавілі суслыка, спыніўшы сеялкі . . 11 г. 51 хв.
12 хв. сеялі . . 12 г. 03 хв.
9 хв. стаялі. Ад няўдалага павароту конь пераступіў нагой праз гуж, прышлося спыніць усе сеялкі, таму што яны ішлі адна за другой без інтэрвалу . 12 г. 12 хв.
7 хв. сеялі . . 12 г. 19 хв.
30 хв. засыпалі насеньне і супэрфосфат . . 12 г. 49 хв.
26 хв. сеялі . . 1 г. 15 хв.
2 гадзіны абедзены перапынак . . 3 г. 15 хв.
37 хв. запрагалі коняй 3 г. 52 хв.
22 хв. сеялі . . 4 г. 14 хв.



Комсамольцы колгасу „Гігант“ на саўбе.

12 хв. засыпалі насеньне і супэрфосфат . . 4 г. 26 хв.
23 хв. сеялі . . 4 г. 49 хв.
17 хв. стаялі. Ішоў цягнік: хлопцы бегалі глядзець, як цягнік расьцісьне пакладзены на рэйкі жалезны прут . 5 г. 06 хв.
18 хв. сеялі . . 5 г. 24 хв.
9 хв. засыпалі насеньне і супэрфосфат . . 5 г. 33 хв.
12 хв. сеялі . . 5 г. 45 хв.
1 г. 20 хв. ехалі да хаты . . 7 г. 05 хв.
1 гадз. ставілі коняй па стайнях і падлічвалі работу . 8 г. 05 хв.

РАЗАМ . .
Сеялі . . 4 г. 53 хв.
Пераезд у поле і назад 2 г. 50 хв.
Засыпалі насеньне і супэрфосфат . 1 г. 10 хв.
Прастоі бяз уважлівых прычын . 6 г. 20 хв.
РАЗАМ колгасьнікі былі на „рабоце“ . 15 г. 15 хв.

На падставе гэтых жудасных паказьнікаў, рацыяналізатарскі гурток вынёс конкрэтную прапанову: час зборкі і выезду ў поле скараціць на 2 гадзіны 55 хв., засыпку супэрфосфату і насеньня—на 53 хв., прастоі бяз уважлівых прычын зьвесьці да нуля. Гэтыя прапановы былі прыняты.

Асабліва паказальнай стала работа 25 брыгады. Яна штодзённа, замест 9-10 га, засявае 13-14 га. На падставе гэтага гурток устанавіў цьвёрдую норму выпрацоўкі для сяльшчыка. Гурток вывучыў работу плугароў і вынес сваю прапанову для палепшаньня колгаснай вытворчасьці. У выніку—нормы выпрацоўкі павялічыліся на 25 пр. плюс 17 проц., дасягнутыя ад устанаўленьня дыстанцыі паміж плугамі.

Змагаюцца за далейшыя бальшавіцкія перамогі

Месячнік баявой вясеньняй трывогі комсамола і падрыхтоўка да 10-цігадовага юбілею газэты „Чырвоная Зьмена“ узьнялі новую хвалю колгаснага руху ў Бялеўскім сельсавеце, Жыткавіцкага раёну.

За гэты час прынята у колгас 18 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак пры першым выезьдзе колгасаў у поле ўступіла яшчэ 5 гаспадарак.

Сельсавет колектывізаваны на 53 проц. Усе колгасы перайшлі на зьдзельшчыну, ацэненую ў працаднёх. Колгас „3-ці Інтэрнацыянал“ за 1 з пал. дні пасеяў 3 га аўсу, 5 га ячменю, вывез 430 вазоў гною, якія раскіданы па полі, і ўзараў 2 га.

У колгасах разгорнута соцспаборніцтва і ўдарніцтва.

У выніку праведзенай ударнай бальшавіцкай работы па падрыхтоўцы да вясны у комсамольскую ячэйку уступіла 18 чалавек колгаснае і бядняцкае моладзі.

М. Вараб'ёў.

Засеялі 78 га

СЛУЦАК, На 1 мая 17 колгасаў Случчыны распачалі ворыва і сяўбу. Засеяна бульбы скорасьпелкі 28 га, аўса 50 га, лёну раньняга 3 га. Заарана 170 га.

За апошнюю дэкаду, з 20-IV па 1-е мая, організаваны 2 колгасы, а ў старыя ўступіла 189 гаспадарак.

Ян Прыбытак.

Першамайскі заклік у колгасы даў 4 новых колгасы і 197 новых колгасьнікаў

ГРЭСК. (На тэлефону ад нашага юнкора). З 25-га красавіка па 5-е мая Райкомам партыі быў праведзены дэкаднік Першамайскага заклiку ў колгасы. Дзякуючы добра праведзенай рабоце, за час дэкадніка хваля колектывізацыі ў раёне значна ўзрасла організаваны 4 новыя колгасы і 60 гаспадарак, а ў старыя колгасы ўлілося 137 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Процант колектывізацыі з 23 узьняўся да 26,9.

Па-бальшавіцку правялі дэкаднік Першамайскага заклiку ў колгасы Пукаўская ячэйка КП(б)Б і ЛКСМБ і колгасы Пухаўскага і Струханскага сельсаветаў. Створаны у гэтых сельсаветах 6 вярбовачных брыгад з колгасьнікаў. Організаваны новы калгас „Брдзёнага“, 59 аднаасобнікаў уступіла ў старыя колгасы. У колгас „Комунар“ Рухаčаўскага сельсавету уступіла 38 гаспадарак, організаваўся новы колгас.

Ц. Макарэнка.

Пошта-тэлеграма.

УСІМ РАЙКОМАМ І БРЫГАДАМ ЦК ЛКСМБ

Брыгадзіры ЦК ЛКСМБ па пасеўкампаніі, студэнты, павінны зьвярнуцца з раёну к 8-V-31 г. Астатнія брыгадзіры, не зьвязаныя з вучобай, застаюцца ў раёнах да 15-V-31 г.

Сэкратар ЦК ЛКСМБ Гуткін.

КОЛЕКТЫЎНЫ ОРГАНІЗАТАР МІЛЬЁНАЎ

павінен яшчэ мацней і бязьлітасьней змагацца за генэральную лінію партыі

Ударная брыгада друку—вядучае зьвяно рабселькораўскага руху

У АДКАЗ УДАРНІКАМ „ПРАЎДЫ" І Ў АДЗНАКУ 10-ГАДОВАГА ЮБІЛЕЮ „ЧЗ"—ВЫСТУПАЕМ З КОНКРЭТНЫМІ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАМІ

Да ўсіх рабочых, колгасьнікаў, рабселькораў, ваенкораў і ўдарнікаў друку

Друк—калектыўны арганізатар мільёнаў

Нашы посьпехі—сотні гігантаў, сотні МТС, тысячы саўгасаў, дзесяткі і сотні тысяч колгасаў, што згуртоўваюць мільёны сялянскіх гаспадарак, рост дабрабыту рабочае клясы і працоўных мас, поўная ліквідацыя беспрацоўя зьяўляюцца простым, непасрэдным і відавочным вынікам цьвёрдага, няўхільнага кіраўніцтва нашай комуністычнай партыі і яе ленінскага Цэнтральнага Камітэту, вынікам рашучай барацьбы на два фронты, разгроеньня, выкрыцьця і разгрому правых і „левых" опортуністых.

У гэтай барацьбе вялізная роля належыць нашаму друку, колектыўнаму агітатару, пропагандысту і організатару мас і, ў першую чаргу, нашай бальшавіцкай „Праўдзе"—цэнтральнаму органу партыі.

Мы горача вітаем пастанову ЦК партыі аб сельскім, раённым нізавым друку, каб стварыць у кожным раёне газэты. Вітаем раённы і партыйныя камітэты, якія атрымліваюць свой арсэнал—самую моцную, самую вострую зброю. Гэта пастанова ЦК павінна быць выканана ва што-бы там ні стала. Бішца за стварэньне ў кожным раёне газэты неабходна таксама, як за сваячасовы поўны пуск 518 новых прадпрыемстваў і 1040 МТС, як за плян трэцяга, рашаючага году пяцігодкі.

Прапануем:

Каб паскорыць тэмпы выкананьня гэтай важнейшай пастановы ЦК, каб мобілізаваць актыўнасьць усіх рабселькораў ударнікаў і найшырэйшых мас рабочых і колгасьнікаў, мы высоўваем наступныя конкрэтныя практычныя прапановы:

1. Мы выклікаем ўсіх рабселькораў-ударнікаў, усіх работнікаў фабрычна-заводзкага і раённага друку ў найкарацейшы тэрмін разгарнуць глыбокае вывучэньне матар'ялаў Леніна і Сталіна, і партыйных пастаноў аб друку.

Узброеныя гэтымі баявымі ленінскімі дакумантамі, мы яшчэ лепш будзем ажыцьцяўляць організатарскую ролю друку ў барацьбе за генэральную лінію партыі, яшчэ больш жорстка выкрываць і выганяць усялякія спробы пераносіць на глебу бальшавіцкага друку прыёмы жоўтай буржуазнай журналістыкі (КУРС, ГУС і інш.).

„ГИЗ РСФСР" павінен забясьпечыць у бліжэйшы час выданьне гэтых матар'ялаў у масавых тыражах.

2. Просім „Праўду" у самы бліжэйшы час прыступіць да сыстэматызацыі і абагуленьня свайго вялізарнага вопыту ў барацьбе за чыстату прынцыпаў марксызму і ленінізму, а таксама вялізарны вопыт непасрэднай організацыі барацьбы на ўсіх вучастках соцыялістычнага будаўніцтва. Гэта вельмі неабходна для яшчэ большага ўкараненьня вопыту „Праўды"—у практыку ўсяго нашага друку і асабліва нізавога.

3. На працягу мая правесьці суботнік (адпрацаваць некалькі гадзін) пролетарскай дапамогі нізавому друку.

4. Рабочых саўгасаў і колгасаў мы выклікаем у час пасеўнай кампаніі засеяць дадаткова звыш пляну гектары ў фонд нізавога друку.

5. З гэтага ўссагульнага фонду нізавога друку імя „Праўды" неабходна вылучыць пэўную суму для стварэньня міжнароднага пролетарскага фонду дапамогі замежнаму рабочаму нізавому друку. Гэта павінна быць пачаткам стварэньня міжнароднага фонду „рабочай капейкі на рабочую газэту".

6. Рэволюцыйныя рабочыя Бэрліну, Варшавы і Парыжу, якія змагаюцца пад сьцягам комуністычных партый Нямеччыны, Польшчы і Францыі, ці ведаеце вы, што да канца 1931 г. у кожным раёне Савецкага Саюзу будзе бальшавіцкая газэта?

Мы выклікаем вас на спаборніцтва. Стварэце да канца 1931 г. на кожным буйным прадпрыемстве моцную баявую, бальшавіцкую шматтыражку. Мы гатовы вам дапамагчы.

7. Рабочыя папяровых фабрык Савецкага Саюзу. Што ў вас чуваць? Ці абмеркавалі вы пастанову ЦК УсеКП(б) аб раённым, сельскім і нізавым друку, ці намецілі вы конкрэтныя абавязацельствы, якія выплываюць для вас з неабходнасьці стварыць газэту ў кожным раёне. Ці падлічылі вы колькі дадатковых тон паперы ад вас патрабуецца,

Ці ясна вам, што і вы адказваеце за выкананьне гэтай пастановы ЦК нашай партыі. Што-ж вы зрабілі, як вы мобілізаваны для таго, каб працаваць так, як працуе Балахна ў апошні час.

Памятайце, за кожную тону недаданай паперы вы будзеце адказваць перад партыяй і рабочай клясай, бо кожная тона недаданай паперы выбівае са строю некалькі раённых газэт.

Мы чакаем ад вас сустрэчны прамфінплян—дадатковыя сотні і тысячы тон паперы ў адказ на пастанову ЦК аб раённым друку.

8. Рост раённага друку патрабуе новых кадраў, новых соцень і тысяч перадавых людзей з рабочае клясы. Мы прапануем з асяродзішча лепшых ударнікаў друку і асабліва ударнікаў „Праўды" вылучыць і падрыхтаваць 300 лепшых таварышоў і паслаць іх не пазьней канца 1931 г. на кіруючую работу ў новаорганізуемыя раённыя газэты. Са свайго боку, мы абавязваемся да канца 1931 г. падрыхтаваць для кіруючай работы ў раённым і нізавым друку 25 лепшых менскіх ударнікаў і рабселькораў. Выклікаем на спаборніцтва гомельскіх, віцебскіх, магілеўскіх, бабруйскіх, ніжагародзкіх, варонескіх, ташкенцкіх і дняпропятроўскіх ударнікаў „Праўды", краёвага, абласнога і раённага друку.

9. Абавязваемся з падлягаючых дэмобілізацыі з радоў Чырвонай арміі падрыхтаваць ня менш 50 лепшых ударнікаў-ваенкораў для кіруючай работы ў раённых і фабрычна-заводзкіх газэтах. Выклікаем усе гарады, дзе знаходзяцца часьці Чырвонай арміі і флёту.

10. Работнікі газэт і часопісаў цэнтральных і абласных, рэспубліканскіх і гарадзкіх, што вы зрабілі для падрыхтоўкі і вылучэньня новых кадраў рабочых і колгасьнікаў на кіруючую работу ў друку.

Мы прапануем вам скласьці дагавары з рэдколегіямі фабрычна-заводзкіх, насьценных і друкаваных газэт. Паводле гэтага дагавору кожны работнік павінен узяць на сябе абавязацельства на працягу году падрыхтаваць для работы ў друку ня менш аднаго ўдарніка-рабкора.

Такім шляхам мы можам падрыхтаваць 7-8 тысяч работнікаў для нашага друку з лепшых ударнікаў.

11. Прафсаюзныя організацыі і гаспадарчыя органы паліграфічных прадпрыемстваў, што вы зрабілі для падрыхтоўкі наборшчыкаў і машыністаў для новаорганізуемых раённых друкарань? Мы прапануем вам узяць на сябе конкрэтныя абавязацельствы з указаньнем колькасьці і тэрміну падрыхтоўкі паліграфкадраў для раённага друку.

12. КІЖ, газэтныя аддзяленьні комвузаў. Раскажыце праз „Праўду" і цэнтральны друк, што вы зрабілі для таго, каб забясьпечыць поўнае і сваячасовае выкананьне пастановы ЦК, як вы перабудавалі сваю работу? Гэта пытаньне надзвычайна цікавіць усіх рабселькораў-ударнікаў.

13. Усе абласныя краёвыя комсамольскія організацыі павінны асьлеваць прыкладу комсамолу Беларусі і мобілізаваць у бліжэйшы час для работы ў друку ня менш 50 актыўных ударнікаў-комсамольцаў.

Просім ЦО „Зьвязду" стаць на чале ажыцьцяўленьня ўсім партыйна-савецкім друкам БССР нашых прапаноў.

14. На аснове шырокай, масавай популярызацыі вопыту „Праўды" з дня друку і да канца мая абвясьціць масавы прызыў у рады ўдарнікаў друку, асабліва раённага і фабрычна-заводзкага. Ударнікі „Праўды" і „Зьвязды" павінны быць першымі організатарамі і застрэльшчыкамі гэтага прызыву. Мы абавязваемся на працягу мая завербаваць 200 новых ударнікаў „Праўды" і фабрычна-заводзкага друку гор. Менску.

15. Выступаючы са сваім лістом, мы ня можам прайсьці міма адозвы тульскіх мэталістых. Мы цалкам і поўнасьцю далучаемся да гэтага дакуманту, дзе з усёй пролетарскай рашучасьцю рэзка крытыкуецца часова адстаючы Донбас—даўжнік краіны.

Разам з тым, мы прымушаны напомніць ударнікам вытворчасьці і друку, усяму раённаму і нізавому друку Донбасу: дарагія таварышы, і вы адказваеце за недаданы вугаль, за запазычанасьць Донбасу. І вы адказваеце за 100-процантнае выкананьне праграмы здабычы вугалю.

Ну што-ж вы, таварышы, зрабілі, якую організатарскую работу правялі для баявой мобілізацыі мас для рашучай і поўнай перамогі ў барацьбе за вугаль. На гэтыя пытаньні чакаем ад вас безадкладнага адказу праз „Праўду".

„Праўдзе"—бальшавіцкае прывітаньне

Мы горача вітаем улюбёную баявую ўдарную бальшавіцкую „Праўду" ў дзень пролетарскага друку ў 19-ю гадавіну слаўнага існаваньня.

На ўзорах „Праўды" вучыўся і рос увесь наш друк. На традыцыях „Праўды" выхоўваліся і загартоўваліся ўсе маладыя растучыя органы бальшавіцкага друку і іх партыйныя кадры.

„Праўда" была і застанецца прыкладам для ўсяго друку, як упарта і непрымірыма трэба змагацца за генэральную лінію партыі, за ленінскае бальшавіцкае адзінства партыйных радоў, за пастановы партыйных зьездаў і цэнтральнага камітэту, за лёзунгі нашай партыі.

Запэўніваем „Праўду", што мы будзем змагацца за далейшае пашырэньне і ўмацаваньне сеткі раённых газэт, за стварэньне новых і новых сапраўдных бальшавіцкіх органаў друку ў раёнах, настойліва і рашуча, як змагаліся рэволюцыйныя рабочыя пад кіраўніцтвам партыі за стварэньне ленінскай „Праўды".

Усё растучы і мацнеючы раённы і фабрычна-заводзкі друк яшчэ цясьней згуртуецца вакол ЦО партыі для новых баёў, для новых посьпехаў і перамог.

Узбройваючыся ўсё больш слаўнымі традыцыямі бальшавіцкага друку, нізавыя газэты яшчэ ў большай ступені зробяцца апорнымі пунктамі „Праўды" і павінны стаць колектыўнымі рабкорамі-ўдарнікамі бальшавіцкай „Праўды".

Менскія ўдарнікі „Праўды" ліст абгаварылі і прынялі:

Рабкоры-ўдарнікі і рабочыя заводу імя Варашылава;

Рабкоры-ударнікі і рабочыя заводу „Ударнік";

Рабкоры-ўдарнікі друкарні імя Сталіна;

Юнкоры-ўдарнікі „Чырвонай Зьмены" з ФЗВ імя КІМ:

Усебеларускія курсы рэдактароў шматтыражных раённых, фабзаводзкіх МТС і колгасных газэт;

Партколектыў заводу „Комунар".

Брыгады друку—вядучае зьвяно рабселькораўскага руху

Пастанова сэкратарыяту ЦК КП(б)Б аб становішчы работ… цэнтральных газэт з рабселькорамі-ўдарнікамі

1. ЦК КП(б)Б констатуе нездавальняючае становішча з сыстэм… тычнай палітычна-выхаваўчай і масавай работай сярод рабселькора… ударнікаў з боку пераважнай часткі цэнтральных газэт БССР.

Лічачы гэта значным політычным недахопам, які перашкадж… яшчэ большаму разьвіцьцю ўдарніцтва ў друку і гэтым самым ху… чэйшаму пераходу ўсяго рабселькораўскага руху на вышэйшую ступе… —ўдарніцтва і брыгадныя мэтоды работы, ЦК КП(б)Б абавязвае р… дакцыі цэнтральных газэт БССР:

а) безадкладна стварыць у кожнай з рэдакцый газэт аддзел уда… ных брыгад друку, мясцовай сеткі і рабселькораў, забясьпечыўш… круты перелом у бок узмацненьня штодзённага кіраўніцтва і вых… ваўчай работы рэдакцыі з рабселькорамі;

б) перабудаваць ўсю работу з рабселькорамі выходзячы з паст… новы ЦК УсеКП(б) ад 16 красавіка, забясьпечыўшы ператварэнь… брыгад друку ў вядучае зьвяно рабселькораўскага руху і ўзмацніўш… ролю рабселькораўскага руху, як актыўнага праваднікa генэральн… лініі партыі;

в) разгарнуць шырокую і масавую падрыхтоўку да надыходзяча… ўсебеларускага зьезду рабселькораў, забясьпечыўшы ўзмацненьне сы… тэматычнай дапамогі нізавым газэтам, якія паводле пастановы Ц… УсеКП(б) павінны зьяўляцца колектыўным рабселькорам цэнтральна… друку, а таксама забясьпечыўшы новы магутны прыток у рады ра… селькораў дзесяткам тысяч рабочых і колгасьнікаў-ўдарнікаў.

2. Прыняць да ведама паведамленьне рэдакцыі газэты „Зьвязд… аб выпраўленьні дапушчанай прамсэктарам газэты памылкі ў пытань… рабселькораўскага руху.

3. Пастановы апублікаваць у друку.

Маладзёжны куток яшчэ ў праэкце

На заводзе „ДА" (Менск) працуе каля 200 чалавек моладзі. Комсамольскі колектыў налічвае 102 членаў КСМ. Здавалася-б, што на заводзе добрая глеба для разьвіцьця юнкораўскага руху сярод моладзі, але гэта толькі здаецца. Праца сярод юнкораў нікуды ня варта. Усяго каля 10 юнкораў працуюць бяз усякага кіраўніцтва.

Шматтыражка дагэтуль выпадкова асьвятляе пытаньне аб становішчы моладзі і колектыву ЕСМ. … ладзь ня мае ў ёй свайго кут… Організацыя маладзёжнага ку… яшчэ ў проэкце.

Неабходна зараз-жа зрабіць з… у гэтай працы і даць належны… рунак разьвіцьцю юнкорруху на заводзе.

Ударная брыгада „Ч.З."
Кавалевіч, Магучы, Анан… Курарэка.

Зараз-жа ўключыцца ў масавы агляд… самаправерку

Ячэйка ЛКСМБ, якая ахоплівае 3 школы ФЗС: 4-ую, 5-ую і 7-ую, зусім ня цікавіцца становішчам насьценгазэт у гэтых школах.

У 4-й і 7-й ФЗС насьценгазэта ня выходзіць па 3—4 тыдні. Ужо адно гэта гаворыць аб тым, што ўвага вучняў не мобілізуецца на выкананьне пастаўленых перад … задач.

У 4-й школе рэдколегія марын… ў сваіх папках каля 300 допіс… Аб гэтым добра ведае комсамольск… ячэйка, але ніякіх захадаў ня пр… мае.

М. Сохань.

20-га мая пачынаецца ўсебеларускі месячнік друку

Пастанова сэкратарыяту ЦК КП(б)Б ад 3 мая 1931 г.

1. Сакратарыят ЦК КП(б)Б пастанаўляе перанесьці сьвяткаваньне па БССР дня друку на 20-га мая, абвясьціўшы з 20-га мая па 20-е чэрвеня ўсебеларускі месячнік друку. **Месячніку надаць характар адказнай палітычнай кампаніі, зрабіўшы яго сустаўной часткай падрыхтоўкі да ўсебеларускага зьезду рабселькораў.** Месячнік друку правесьці пад знакам яшчэ большага павышэньня ролі партыйна-савецкага друку у разгорнутым соцыялістычным наступленьні, ліквідацыі кулацтва як клясы на базе суцэльнай колектывізацыі, у барацьбе за ленінскую нацыянальную політыку, супроць вялікадзяржаўнага шовінізму—найбольш небясьпечнага на даным этапе, ні на хвіліну не аслабляючы самай непрымірымай і жорсткай барацьбы з шовінізмамі ўсіх іншых колераў, яшчэ большага павышэньня ролі друку ў барацьбе за генэральную лінію партыі, супроць правага ўхілу—галоўнай нябясьпекі данага пэрыоду, «левых» загібаў і прымірэнцтва да ўхілаў.

Месячнік друку павінен зьявіцца генэральнай опэрацыйнай праверкай таго, наколькі пасьпяхова ўвесь друк змагаецца за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, за гаспадарчы разрахунак, адзінаначальле, аўладаньне тэхнікай сваёй справы, за ўшчыльненьне тэрмінаў сяўбы, пераход колгасаў на зьдзельшчыну, падрыхтоўку да ўборачнай кампаніі, за ўздым новай магутнай хвалі колгаснага прыліву.

Месячнік друку павінен прайсьці пад знакам яшчэ больш настойлівай і шырока разгорнутай барацьбы ўсяго пролетарскага друку за ператварэньне соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва ў штодзённыя мэтоды ўсёй работы па соцыялістычнаму будаўніцтву, за разгортваньне пролетарскай самакрытыкі і забясьпечаньне яе дзейнасьці. Месячнік друку павінен узмацніць работу газэт па інтэрнацыянальнаму выхаваньню. У прыватнасьці сыстэматычнае асьвятленьне на старонках друку БССР гэроічнага рэволюцыйнага змаганьня компартый і рабочых капіталістычных краін (у асаблівасьці Заходняй Беларусі і Польшчы).

Усю работу па месячніку друку трэба органічна злучыць з узмацненьнем партыйнага кіраўніцтва нізавым друкам і рабселькораўскім рухам і барацьбы за практычнае ажыцьцяўленьне пастаноў ЦК УсеКП(б) аб перабудове рабселькораўскага руху і аб сельскім, раённым і нізавым друку, у прыватнасьці аб ператварэньні ўдарных брыгад друку ў вядучае зьвяно рабселькораўскага руху.

2. У дзень 5-га мая цэнтральны і раённы друк БССР зьмяшчае матар'ялы, прысьвечаныя гадавіне „Праўды", а 20-га мая выпускаюцца спэцыяльныя нумары газэт, прысьвечаныя месячніку друку.

3. Абавязаць цэнтральны, гарадзкі і раённы друк, а таксама друкаваныя шматтыражкі забясьпечыць шырокае і сыстэматычнае асьвятленьне як падрыхтоўкі, так і праведзеньне як месячніка друку, так і ўсебеларускага зьезду рабселькораў.

4. Культпропу ЦК КП(б)Б разаслаць на месцы дырэктыўны ліст аб праведзеньні месячніка друку.

5. Пастанову апублікаваць у друку.

ПА ОПОРТУНІСТЫЧНЫХ СЬЛЯДОХ

ГОРАЦКАЯ І ЧАШНІЦКАЯ СПРАВЫ НІЧАМУ НЕ НАВУЧЫЛІ СЬМІЛАВІЦКУЮ І КАСЬЦЮКОВІЦКУЮ РАЙОРГАНІЗАЦЫІ ЛКСМБ

Яшчэ больш мобілізаваць комсамольскія масы на барацьбу за генэральную лінію партыі, супроць права-опортуністычнай практыкі і „левых" загібаў

Па канкрэтных выніках ацэньваецца работа таго ці іншага зьвяна комсамолу ў мобілізацыі рабочае колгаснае, бядняцкае і серадняцкае моладзі на барацьбу за індустрыялізацыю, суцэльную колектывізацыю і ліквідацыю на яе аснове кулацтва як клясы.

Выходзячы з гэтага пункту погляду, бюро ЦК ЛКСМБ, заслухаўшы даклады бюро Чашніцкага, Горацкага і Барысаўскага РК ЛКСМБ і адзначыўшы паварот комсамолу тварам да задач рэконструкцыі народнае гаспадаркі, з усёй рашучасьцю ўдарыла па кіраўніцтву РК ЛКСМБ, якое ня здолела стаць на чале „узросшай актыўнасьці і ініцыятывы мас, накіраванай на наш бок, у бок удзелу ў соцыялістычным будаўніцтве".

Менавіта за правую практыку былі распушчаны ў свой час бюро Горацкага РК ЛКСМБ, на чале якога стаяў вядомы ўсім „гора-тэорэтык" Целешаў, і бюро Чашніцкага РК ЛКСМБ, на чале якога стаяў падгалосак Целешава—Шурык, які разам з Целешавым пад адну і тую самую кулацкую дудку сьпяваў аб безактыўнасьці і крызысе ў саюзе, ня бачаўшы сапраўднай гэроікі мас у барацьбе за соцыялізм.

Кіраўніцтва вышэй пералічаных РК ЛКСМБ не перабудавала сваю работу ў адпаведнасьці з соцыялістычнай рэконструкцыяй. Бюро РК былі нячуткія, працавалі абломаўскімі тэмпамі і накшталт гогалеўскіх Пацюкоў чакалі пакуль каўдуны будуць самі ў рот скакаць. Яны не працавалі па-бальшавіцку, па-ленінску, а па-абломаўску. Вынікі такога „кіраўніцтва" не маглі не адбіцца і на організацыі.

Здавалася, што справа гэтых дзьвёх раённых організацый павінна была паслужыць сыгналам для ўсіх комсамольскіх організацый, каб не паўтарыць гэтых грубых памылак і па-сапраўднаму мобілізаваць масы комсамольцаў на змаганьне за генэральную лінію партыі, наносячы руйнуючы ўдар па опортуністым і ныцікам розных масьцей.

На вялікі жаль бюро Сьмілавіцкага і Касьцюковіцкага РК ЛКСМБ і організацыі цалкам нічога ня вынесьлі з гэтых вурокаў.

Што было ў Сьмілавічах і Касьцюковічах?

На падставе трывожных сыгналаў друку, і ў прыватнасьці. „Чырвонай зьмены", ЦК ЛКСМБ правёў агляд-праверку работы гэтых 2-х організацый.

Праверка паказала, што ў выніку права-опортуністычнага кіраўніцтва бюро райкому, задачы соцыялістычнай рэконструкцыі не займалі ніякага мейсца ні ў другой організацыі. Гэта пытаньне абышлі большасьць комсамольскіх ячэек. Ячэйкі займаліся чым хочаш, але толькі не колектывізацыяй.

Пастановы комсамольскага зьезду аб 100процэнтным уступленьні комсамольцаў у колгасы, ніводнай з гэтых організацый ня выканана. Асабліва вызначаецца Касьцюковіцкая, дзе ахоплена толькі 45—50 проц. комсамольцаў у колгасах.

Крыху лепш у Сьмілавіцкім раёне — там 72 проц. комсамольцаў у колгасах.

Тэмпы падрыхтоўкі да сяўбы як адным, так і ў другім былі яўна незадавальняючыя. І ў выніку Сьмілавіцкі раён выйшаў на сяўбу з 16 проц. колектывізаваных гаспадарак.

Большасьць комсамольскіх ячэек (Абчацкая, колгасу „Комінтэрн" — Сьмілавіцкі раён, Батаева, Дзямідавічы — Касьцюковіцкі раён), стаячы пытаньне аб падрыхтоўцы да веснавой сяўбы, абмяжоўваліся рэзолюцыяй: „Організаваць брыгады... па ачыстцы насеньня і збору попелу".

Побач з гэтымі ячэйкамі, якія займаліся хоць зборам попелу, маем і такія ячэйкі (Сьмілавіцкая, Пярэжырская, саўгасу Зьвер'е, Абчацкая), якія наогул не абгаварвалі пытаньне аб колектывізацыі і веснавой сяўбе.

Рашэньні РК ЛКСМБ па гэтых пытаньнях ня былі даведзены да комсамольскіх мас, да батрацкай і бядняцка-серадняцкай моладзі.

Героі правых спраў

У раёнах паасобныя колгасы засьмечаны кулацка-варожымі элементамі. Так, у колгасе „Праца", Рудзенскага раёну, прыняты дзьве гаспадаркі... былога жандара і яго брата.

У адным колгасе (організаваным Жыткавіцкай ячэйкай), якому было нададзена ганаровае званьне „10-ты зьезд ЛКСМБ", з 10 гаспадарак—6 заможных і адна былога паліцэйскага. Другі колгас, організаваны Драчкаўскай ячэйкай, як яўна-кулацкі, нават ня быў зарэгістраваны раённымі організацыямі.

Як бачым, організатары гэтых двух кулацкіх колгасаў праводзілі ў жыцьцё правую опортуністычную тэорыю „мірнага ўрастаньня кулака ў соцыялізм".

Засьмечанасьць колгасаў яўна кулацка-варожымі элементамі ня рэдкасьць як у адным, так і ў другім раёне. Бязумоўна, што гэтая засьмечанасьць перашкаджае росту колгасаў за лік бядняцка-серадняцкіх мас.

Комсамольскія ячэйкі і бюро РК ЛКСМБ, ведаючы аб усім гэтым, ніякіх захадаў па ачыстцы колгасаў ад кулацка-варожых элементаў ня прынялі. Яны прымірэнча адносіліся да гэтага.

За паўгода бюро Сьмілавіцкага РК ЛКСМБ не заслухала ніводнай справаздачы колгаснай, альбо вясковай ячэйкі аб удзеле іх у колгасным будаўніцтве.

Па ўказцы кулака

Разгортваньне колгаснага будаўніцтва як у адным, так і ў другім раёне праходзіць ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы. Кулак, яго агентура аказвае шалёнае супраціўленьне організацыі колгасаў. Былі выпадкі, калі паасобныя ячэйкі і комсамольцы [illegible] клясаваму ворагу, а мясцамі і пайшлі за ім. Так, сакратар комсамольскай ячэйкі колгасу „Зьвязда" Крывіцка, самавольна [illegible] раскулачаную гаспадарку, дзе [illegible], і аддаў яму назад. Ён не дапамагаў сельсавету выявіць кулацка-заможныя гаспадаркі, а наадварот—пісаў заявы, каб [illegible]. Сакратар ячэйкі колгасу „Сталіна" і сакратар ячэйкі колгасу „Фрунзэ" [illegible] за сувязь з клясавым ворагам. Комсамольцы „Комінтэрн" п'янствуюць разам з вычышчанымі з колгасу.

Комсамольская ячэйка колгасу „Зьвязда" [illegible] старшыню колгасу.

Ячэйка камуны „Фрунзэ" падтрымлівае думку старшыні колгасу аб тым, што „у комуне працы непатрэбны".

Пры такой „пастанове" працы па організацыі колгаснага прыліву, з комуны выйшлі 4 бядняцкія гаспадаркі 6 адзіночак, якія працавалі там 4 гады.

Адначасова з яўна права-опортуністычнай практыкай, якая мела месца ў організацыі Сьмілавіцкага раёну, маем факты цеснага перапляценьня правай практыкі з „левымі" загібамі. Так, у вёсцы Харэвічы, Лукорскага сельсавету, пасьля праведзенага сходу не ўдалося організаваць колгас. У гэты-ж дзень 20 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак былі абкладзены цьвёрдымі заданьнямі.

Комсамол абышоў кантрактацыю

Комсамольскія організацыі Сьмілавіцкага і Касьцюковіцкага раёнаў ніякай увагі кантрактацыі не аддалі. Адозвы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб кантрактацыі ніводнай комсамольскай ячэйкай не прапрацаваны. Больш таго, гэта пытаньне не стаяла на бюро райкомаў. У сучасны момант плян кантрактацыі па Сьмілавіцкім раёне выкананы на 83 проц., а па Касьцюковіцкім на 82,5 проц. па збожжавым культурам і 50 проц. па тэхнічным.

Нямыя сьведкі жудасных злачынстваў

Ня гледзячы на здаровае гаспадарчае становішча колгасаў і комун гэтых раёнаў, ёсьць факты калі кіраўніцтва паасобных колгасаў сваёю злачыннай бязьдзейнасьцю разлагае гаспадарку, комсамол стаіць у баку. Так, старшыня комуны імя Фрунзэ, ён-жа сэкратар партыйнай ячэйкі, беспрасып на п'янстве і не зьвяртае ніякай увагі на працу комуны. За два тыдні з 100 сьвіней у комуне засталося ўсяго 12, 52 палі, рэшту прырэзалі. На працягу 3-х дзён палі 3 каровы. Адчыненую сілосную яму старшыня загадаў пакінуць адкрытай, а назаўтра яма была занесена сьнегам і абрушылася. Комсамольцы комуны на гэта злачынства не зьвярнулі ўвагі. Наадварот, комсамольцы знаходзяцца ў першых радох прагульшчыкаў. Комсамольцы ячэйкі колгасу „Зьвязда", які зьяўляецца сьвінаводчым, ня прымаюць ніякіх мер, каб зьнішчыць буйнейшы прарыў у колгасе.

Прэміі... гарэлкай

У часе малацьбы ў саўгасе „Зазер'е", дырэктар саўгасу запрапанаваў рабочым за перавоз малатарні выдаць 110 рублёў у фонд прэміі на гарэлку.

Увечары, пасьля працы, гарэлка была падзелена паміж усімі рабочымі, якія цэлую ноч п'янствавалі. Комсамольская ячэйка прымала актыўны ўдзел у атрыманьні „прэміі", а сэкратар ячэйкі гаварыў: каб не гарэлка, малатарню так хутка не перавезьлі-б.

Такія-ж факты п'янкі і ў іншых ячэйках («Комінтэрн„, „Дукоры"— Сьмілавіцкі раён, Сялецкая, Ткаціцы і Смолькі—Касьцюковіцкі раён).

Такі „ўдзел" дзьвюх комсамольскіх організацый у гаспадарчым будаўніцтве зьявіўся вынікам опортуністычнага кіраўніцтва раённых камітэтаў, а ў Касьцюковіцкім раёне—вынікам засьмечанасьці бюро РК ЛКСМБ кулацкім элементам, вынікам разлажэньня кіруючай верхавінкі.

Бюро ЦК ЛКСМБ, абгаварыўшы становішча Сьмілавіцкай організацыі, распусьціла бюро РК ЛКСМБ і прыняло рад захадаў да аздараўленьня організацыі. Новаму кіраўніцтву трэба зяцца за ачыстку ўсіх ячэек ад права опортуністычных элемэнтаў.

Комсамольскія ячэйкі і камітэты, і ў першую чаргу гэтых двух раёнаў, павінны зрабіць для сябе з гэтай справы адпаведныя вынікі і павярнуцца сапраўды да задач соцыялістычнай рэконструкцыі сельскае гаспадаркі, правесьці па-ўдарнаму другую бальшавіцкую вясну, падрыхтавацца да ўборачнай кампаніі і забясьпечыць выкананьне рашэньняў ЦК КП(б)Б аб 45 проц. колектывізацыі БССР да канца 1931 году. Дабіцца 100 проц. ахопу комсамольцаў колгасамі, ударніцтвам і соцспаборніцтвам. Усе комсамольскія організацыі павінны зрабіць адпаведныя вывады з Сьмілавіцкай справы.

Х. Б



Пад опортуністычным доглядам

Белкоопсаюз дрэнна рыхтуе кадры

Даць органам соцыялістычнага забесьпячэньня падрыхтаваных працаўнікоў

Выкананьне пастановы ЦК УсеКП(б) аб ўзмацненьні, рашучым павароце спажывецкай коопэрацыіі тварам да задач соцыялістычнага будаўніцтва павінна быць забясьпечана падрыхтаванымі пролетарскімі кадрамі.

Неабходна рашуча змагацца з праявамі опортуністычнага, дзяляцкага падыходу да справы падрыхтоўкі кадраў з боку асобных зьвеньняў спажывецкай коопэрацыіі.

Факты зрыву організацыі школ ФЗВ коопвучаў ведамсьцьвенны падыход да працы падрыхтоўкі кадраў, наўлік агульных задач падрыхтоўкі пролетарскіх кадраў, трэба расцэньваць як нежаданьне ажыцьцяўляць на практыцы перабудову працы сыстэмы спажывецкай коопэрацыі.

Менскі, Гомельскі, Бабруйскі і Магілеўскі ЦРК павінны адказваць за злачынае ігнараваньне пастаноў партыі.

Опортунізм у падрыхтоўцы кадраў

Сэктар кадраў Белкоопсаюзу, організоўваючы рад школ па падрыхтоўцы кадраў для ўсёй сыстэмы БССР, намеціў арганізацыю школ для падрыхтоўкі працаўнікоў гарадзкае сеткі ў галіне абмену, разьмеркаваньня іх грамадзкага харчаваньня. З гэтых школ было намечана організаваць у Гомелі школы Коопвучу, у Магілеве і у Бабруйску школу Коопвучу і ФЗВ кулінараў. Але опортуністычныя адносіны паасобных ЦРК да падрыхтоўкі кадраў сарвалі своечасовае адчыненьне школ. Маючы вялікую сетку грамадзкіх сталовых, Магілеўскі ЦРК адмаўляўся ад організацыі школ ФЗВ, спасылаючыся на тое, што яму „кадры непатрэбны". Магілеўскі ЦРК ня толькі адмовіўся організаваць 2 школы ФЗВ, але наогул ігнаруе справу падрыхтоўкі кадраў. У апараце ЦРК да гэтага часу няма працаўніка па кадрах.

У Гомельскім ЦРК была сарвана організацыя школы Коопвучу. Гомельскія коопэратары ў сваім імкненьні сарваць падрыхтоўку кадраў нават ня спыніліся перад тым, каб адмяніць ужо пачатае комплектаваньне школы.

Бабруйскі ЦРК зьняў працаўніка на кадрах, які спраўляўся з сваёй працай і перакінуў яго на іншую

Падрыхтоўка кадраў адсунута на задні плян. Да яе падыходзяць выключна комэрцыйна, ня ўлічваючы агульных задач падрыхтоўкі кваліфікаваных пролетарскіх кадраў.

Неабходна рашуча змагацца за організацыю сапраўднай падрыхтоўкі кадраў па сыстэме Белкоопсаюзу.

А.

З 600—270

Максымальнае разгортваньне школ ФЗВ набывае вялікае значэньне ў падрыхтоўцы кадраў для асноўных зьвеньняў і прадпрыемстваў спажывецкай коопэрацыі. Але лічбы ўкомплектаваньня школ па сыстэме Белкоопсаюзу сьведчаць аб тым, што задача разгортваньня сеткі школ не ажыцьцяўляецца.

У школах ФЗВ і КТУ Белкоопсаюзу на 1-е студзеня 1931 году павінна было займацца 1.150 асоб. Займалася 904.

У лютаўскі набор павінна быць прынята 600. Пакуль ёсьць весткі аб тым, што прынята 270, з іх прыступілі да заняткаў 190. Дагэтуль не распачата ўкамплектаваньне саўгасвучу пры Менскім ЦРК. Не падрыхтавана памяшканьне для набору ў школу ФЗВ грамадзкага харчаваньня пры Гомелькім і Віцебскім ЦРК. Сарвана організацыя школы пры Магілеўскім ЦРК.

Тут ў першую чаргу вінаваты Белкоопсаюз і ня ў меншай меры органы БКС на мясцох.

Герасімаў

Кадры спажыўкоопэрацыі

„Засьмечанасьць апарату спажывецкай коопэрацыі клясава-варожымі элементамі ставіць э надзвычайнай сур'ёзнасьцю задачу рашучага аднаўленьня кадраў коопэрацыйнай сыстэмы.

(З рэзолюцыі аб'яднанага Пленуму ЦК і ЦКК па дакладу Цэнтросаюзу, сьнежань 30 г.).

Рашэньне аб'яднанага сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) і студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б) аб перабудове працы спажывецкай коопэрацыі адпаведна з задачамі рэконструкцыйнага пэрыоду, вельмі рашуча паставілі перад Белкоопсаюзам задачу забясьпячэньня гэтай перабудовы падрыхтаванымі пролетарскімі кадрамі.

Складзеныя ў лістападзе 30 г. сэктарам кадраў Белкоопсаюзу кантрольныя лічбы падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў, якімі прадугледжвалася падрыхтаваць і пераподрыхтаваць 461 асоб не адпавядалі задачам поўнага забясьпечаньня коопэрацыйнай сыстэмы кадрамі. А таму, неабходна было перагледзець пляны падрыхтоўкі кадраў у напрамку фарсаваньня падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай кампаніі кадраў трактарыстых, агароднікаў, аборнікаў, паляводаў, кухарак і інш.

Ня гледзячы на рад сур'ёзных недахопаў у працы сыстэмы падрыхтоўкі кадраў, адсутнасьць дапамогі паасобных устаноў, якія, як напрыклад НКЗем, маючы тэхнічныя сродкі, нічым не дапамаглі ў працы курсаў спажыўкоопэрацыі,—к 1-му красавіка ўжо быў зроблены першы выпуск курсаў асноўных кваліфікацый: агароднікаў—51 чал. трактарыстых—58 чал., рабочых-агароднікаў—286, бухароў—33 ч., кухарак—162, пекароў—90 ч., загадчыкаў сталовых—25 ч., старшых аборнікаў—38 ч., масларобаў—40 ч., кіно-мэханікаў—40 ч., радыё-манцёраў—43 ч., кніжнікаў—66 ч., рабочых-даярак—200 ч., паляводаў—200 ч. і работніц ясель—250 ч.

Зараз, пры наяўнасьці значнай колькасьці падрыхтаваных рабочых для гаспадарак, кіраўнікі прыгарадных гаспадарак павінны зьвярнуць асаблівую ўвагу на найбольш поўнае рацыянальнае і правільнае скарыстаньне падрыхтаваных працаўнікоў. Але ўжо зараз мы маем выпадкі злачыннага скарыстаньня падрыхтаваных рабочых. Маладых спэцыялістых, атрымаўшых веды жывёлавода, скарыстоўваюць у якасьці даяроў.

Чарговая задача ў падрыхтоўцы кадраў для прыгарадных гаспадарак—забясьпечыць падрыхтаванымі рабочымі сьвінаадкормачныя пункты.

Каб выканаць задачы падрыхтоўкі кадраў для сыстэмы спажывецкай коопэрацыі, неабходна цалкам выканаць пастановы студзеньскага пленуму ЦК КП(б) аб дапамозе спажывецкай коопэрацыі, аб прадстаўленьні ёй неабходных тэхнічных умоў для падрыхтоўкі кадраў.

А. Смалякоў.

Культэстафэта другога этапу

Тут маршрут № 3 у палоне опортуністых

Прыцягнуць да суровай адказнасьці смалявіцкіх і бялыніцкіх опортуністых, якія, хаваючыся за шыльдай об'ектыўных прычын, зрываюць ажыцьцяўленьне політэхнізацыі

КОМСАМОЛЬЦЫ, МОБІЛІЗУЙЦЕСЯ НА БЯЗЬЛІТАСНУЮ БАРАЦЬБУ ЗА ЯКАСЬЦЬ УСЕАГУЛЬНАГА НАВУЧАНЬНЯ НА АСНОВЕ ПОЛІТЭХНІЗАЦЫІ!

ГЕНЭРАЛЬНАЯ ЗАДАЧА

У барацьбе за політэхнічную школу ўжо заваяваны першыя пазыцыі. Зроблена масавае прымацаваньне школ да прадпрыемстваў, організавана вытворчая практыка, значна ўзмацнілася соцспаборніцтва і ўдарніцтва як мэтод комуністычнага выхаваньня, значна ўзрасло грамадзка-політычнае значаньне школы ў выкананьні задач соцыялістычнага будаўніцтва.

Аднак, здабытыя посьпехі ў пераводзе школы на рэйк політэхнізацыі ні ў якім разе не забясьпечваюць поўнага выкананьня пастаноў партыі комсамольскіх зьездаў і ўсебеларускага зьезду па політэхнізацыі аб перабудове школы. Аб гэтым красамоўна сьведчыць матар'ял, які мы сёньня друкуем.

Там, дзе пануе опортуністычная недаацэнка справы політэхнізацыі, там вытворчая практыка разглядаецца як вузкае рамесьніцтва, там толькі формальныя дасягненьні, там школа яшчэ захавала па сутнасьці славесна-начотніцкі характар.

3-ці маршрут культэстафэты другога этапу зусім правільна мобілізуе ўвагу ўсёй савецкай грамадзкасьці на барацьбу „за якасьць усеагульнага навучаньня на аснове політэхнізацыі"; бо толькі пры гэтай умове магчыма сапраўдная перабудова школы, магчымы посьпехі ўсеагульнага навучаньня.

Зараз, калі школы ў большасьці прымацаваны да пэўных прадпрыемстваў, колгасаў і саўгасаў, ва ўсёй велічы паўстае задача разгортваньня політэхнізацыі ў глыбіню, узьняцьця будаўніцтва школы на вышэйшую ступень. Барацьба за якасьць—генэральная задача новага этапу політэхнізацыі.

Комсамольскія організацыі ў поўным кантакце з масамі асьветнікаў, пад кіраўніцтвам партыі, мобілізуючы ўвагу ўсёй савецкай грамадзкасьці на выкананьне маршрутаў культэстафэты другога этапу, павінны максымум увагі аддаць барацьбе за якасьць політэхнізацыі, за выкананьне 3-га маршруту.

Комсамольскія організацыі павінны безадкладна разгарнуць праверку выкананьня заключаных дагавораў па політэхнізацыі, бо толькі шляхам організацыі пролетарскага кантролю над выкананьнем гэтай важнейшай задачы, можна дамагчыся ажыцьцяўленьня барацьбы за якасьць політэхнізацыі і гэтым самым узьняць яе (політэхнізацыю) на яшчэ больш вышэйшую ступень,

Сьмілавічы падаюць паўторны сыгнал


Да адказнасьці зрыўшчыкаў політэхнізацыі

Сьмілавічы. Ня гледзячы на сыгналы друку, у Сьмілавіцкім раёне ў галіне політэхнізацыі зруху няма. Партыйныя, комсамольскія і грамадзкія організацыі гэтым пытаньнем не займаюцца.

У большасьці школ заключаныя дагаворы з прадпрыемствамі ня выконваюцца. У Сьмілавіцкай, Дукорскай, Дукорчанскай, Жораўскай, Хоравіцкай і інш. школах майстэрняў няма. Кіраўніцтва школ хаваецца за шыльду об'ектыўных прычын, даводзячы аб тым, што няма дзе ўзяць прылад, няма сродкаў. Сторынская школа нават ня прымацавана ні да якога прадпрыемства.

РК ЛКСМБ не аддае належнай увагі пытаньню разгортваньня політэхнізацыі.

Пост „Чырв. Зьмены" Ц. Лявіцкі.



На занятках у школе.

На варце... славеснасьці

Бялынічы. Пытаньне політэхнізацыі Бялыніцкай сямігадовай комунальнай школы абгаварывалася на школьнай радзе, на сходзе вучняў, на сходзе піонэраў і на сходзе комсамольцаў. І ня гледзячы на гэта, школа і на сёнешні дзень застаецца такой, як была: славеснай, начотніцкай.

У м. Бялынічах маецца шмат прадпрыемстваў: млын, сукнавалка, электростанцыя, лесапільны завод. Ня гледзячы на гэта, школа ня ўжывае захадаў да перабудовы сваёй работы.

Цэлы год толькі і гутаркі аб політэхнізацыі, а справы няма. Для ажыцьцяўленьня-ж політэхнізацыі ўсе магчымасьці ёсьць, трэба як мага хутчэй выкарыстаць іх, выступіць, нарэшце, за ажыцьцяўленьне політэхнізацыі.

Комсамолец.

Пэдфакаўцы, так нельга працаваць!

Пэдфак БДУ прыступіў да непасрэднага ажыцьцяўленьня політэхнізацыі. Соц.гістарычнае, політасьветнае і літаратурна-лінгвістычнае аддзяленьні працуюць у майстэрнях індустрыяльна педагогічнага тэхнікуму, студэнты фізіка-тэхнічнага аддзяленьня—на фабрыках і заводах Менску.

Ва ўмовах пэдфаку нам неабходна ня толькі політэхнізавацца самім, але заняцца адшуканьнем форм і і мэтадаў ажыцьцяўленьня політэхнічнага навучаньня ў шырокім маштабе. Пэдфак павінен зьявіцца своеасаблівай кузьняй політэхнізацыі.

На жаль, да гэтага часу ў нас політэхнізацыя праходзіць самацёкам. У частцы студэнтаў няма выразнага разуменьня задач політэхнізацыі. Дэканат да гэтай справы адносіцца формальна. Загадчык вытворчай практыкі т. Радзіеўскі дрэнна орыентуецца ў пытаньнях сваёй работы. Профэсар Панкевіч наведаў аднойчы сьлесарны цэх, у якім працуюць студэнты. але і не націкавіўся пытаньнем як-жа праходзіць політэхнізацыя.

Частка студэнтаў адносіцца да працы нядбайна. Наведваньне вытворчых заняткаў у сярэднім ня больш 50 проц.

Бываюць выпадкі зрыву заняткаў Зусім слушна, што якасьць політэхнізацыі пры такой пастаноўцы справы дужа дрэнная.

На фронце політэхнізацыі ў Пэдфаку ганебнае становішча. Ні профком, ні комсамольскі колектыў не займаюцца пытаньнямі політэхнізацыі.

Патрэбна у самым тэрміновым парадку организаваць праверку ажыцьцяўленьня політэхнізацыі і дамагчыся палепшаньня якасьці яе.

Ярашэвіч.

Неадкладна склікаць конфэрэнцыю

Буда-Кашалёва. Да гэтага часу, ня гледзячы на зусім выразныя дырэктывы з боку кіруючых органаў аб правядзеньні дзіцячых конфэрэнцый па політэхнізацыі, у Буда-Кашалёве такая конфэрэнцыя не праведзена. Нават невядома, калі яна павінна адбыцца. Падрыхтоўкі ў школах і атрадах не разгорнута, а між тым, скліканьне гэтай конфэрэнцыі надзвычайна насьпела, вельмі неабходна, бо політэхнізацыя школ у раёне стаіць ня зусім на належнай вышыні.

Патрэбна ў бліжэйшы час гэтую конфэрэнцыю склікаць і на ёй заваструць пытаньне барацьбы за якасьць політэхнізацыі. **Вялікові́ч.**

Замацаваць здабытыя посьпехі

Якасьць—у парадак дня

Лельчыцкая школа колгаснай моладзі дамаглася бясспрэчных дасягненьняў у ажыцьцяўленьні політэхнізацыі. Пасьля заключэньня соцдагавору з колгасам, зараз-жа была разгорнута практычная работа. 7-я група прыступіла да навуковага кармленьня жывёл у колгасе. Колгас пад наш нагляд вылучыў 16 кароў. У выніку работы па догляду за гэтымі каровамі мы маем падвышэньне ўдойнасьці малака на 35 літраў у дзень. 6-я група зараз-жа пераключылася на працу гумне.

Вучні ШКМ аказваюць актыўную дапамогу колгасу ў падрыхтоўцы і правядзеньні вясеньняй сяўбы, вывучаюць процэсы працы машын.

Малодшы концэнтр і частка 5-й групы яшчэ не перайшлі на рэйкі політэхнізацыі, хаця часткова і вывучалі працу ў колгасе.

Акрамя таго, школай заключаны дагавор з мясцовым комбінатам і там кожны дзень брыгады школы вывучаюць розныя машыны.

Школе патрэбна цяпер асабліваю ўвагу аддаць пытаньню барацьбы за якасьць політэхнізацыі.

Лельчук Арон

Забясьпечыць работу для поўнага выкананьня пляну лесасплаву

Усім райкомам КП(б)Б

ЦК адзначае, што большасьць раёнаў не прыдае значэньня лесасплаву, як важнейшай гаспадарча-політычнай кампаніі. У організацыі і хо-дзе лесасплаву пануе вялікі самацёк. З мэтай забясьпечыць выкананьне пляну лесасплаву ў веснавы пэрыод, ЦК прапануе: скласьці каляндарны плян п раёне на правядзеньне лесаорганізацыямі сплаву, своечасовай вязкі, сплотк і сартоўкі лесу на прыстанях; прыняць меры для рацыянальнага скары станьня такеляжу флёту, аднаўленьня разбураных шлюзаў і плацін, абгаварыўшы ў райкоме ўсе пытаньні сплаву. Організаваць бесьперабойную вярбоўку плытагонаў замацаваньне іх на ўвесь пэрыод. Бесьперабойнае забясьпечаньне рабочых прадуктамі і прамтаварамі праводзіць строга ў межах норм. Прыцягнеце да сплаву, як да політычна-гаспадарчай кампаніі усе партыйныя і комсамольскія організацыі, шырокую грамадзкасьць асабліва профсаюзы. Укараняйце брыгадныя мэтоды працы, практыкуйце прэміяваньне ўдарнікаў, разгортвайце соцспаборніцтва. Сыстэматычна правярайце і дапамагайце ў ходзе сплаву.

Сэкратар ЦК КП(б)Б ШАРАНГОВІЧ

Усім сэкратарам гаркомаў і райкомаў ЛКСМБ

Пошта-телеграма

Правядзеньне політмінімуму зрываецца. Рашэньне ЦК УсеЛКСМ і ЦК ЛКСМБ па гэтаму пытаньню ня выконваецца. ГК і РК нават яшчэ не абгаварылі пытаньня політмінімуму ў камітэтах КСМ. Рашэньне ЦК аб політмінімуме не даведзена да ячэйкі і кожнага комсамольца паасобку. ЦК расцэньвае гэта як недаацэнку значэньня рэвалюцыйнай тэорыі, як нежаданьне выконваць рашэньне зьезду аб ліквідацыі політняпісьменнасьці сярод вясковых комсамольцаў. ЦК катэгорычна, пад асабовую адказнась сэкратароў ГК і РК, прапануе: 10-га мая прадставіць ЦК ЛКСМ опэрацыйныя пляны і матар'ял ГК і РК па правядзеньню полі мінімуму. ЦК папярэджвае ш невыкананьне рашэньняў ЦК політмінімуме прымусіць ЦК пры няць рашучыя меры да асобны ГК і РК і конкрэтных вінавайца зрыву політмінімуму.

Сэкратар ЦК ЛКСМБ Гуткін
Заг. аддз. тэорыі і пропаганд ЦК ЛКСМБ Пэрліна.

Дапаможам Армянскай рэспубліцы ліквідаваць вынікі землятрасеньня

Комсамольскія ячэйкі, разгарнеце работу па збору сродкаў!

Землятрасеньнем у Арменіі разбураны дзесяткі сёл. Сотні забітых, тысячы параненых. Гэта стыхійнае няшчасьце прынесла вялікія страты, тым больш, што супала з пачаткам вясеньняга севу.

Урад Армянскай рэспублікі ў сваёй адозьве заклікае працоўнае насельніцтва Арменіі і братэрскіх рэспублік мобілізаваць сілы на ліквідацыю вынікаў землятрасеньня.

Наш абавязак—дапамагчы братэрскай рэспубліцы Арменіі. Комсамольскія ячэйкі фабрык, заводаў і колгасаў, пад кіраўніцтвам партыйных разам з савецкімі і грамадзкімі організацыямі Чырвоным крыжам, павінны правесьці рад мерапрыемстваў, наладзіць збор сродкаў на ліквідацыю вынікаў землятрасеньня, організаваць суботнікі, адпрацоўку лішніх гадзін, выхадных дзён і г. д.

Разгарнуць работу па аказаньню дапамогі

Савецкая грамадзкасьць і організацыя Чырвонага крыжу пачалі работу па дапамозе насельніцтву братэрскай рэспублікі.

Першы транспорт з мэдыкамэнтамі, харчамі і лекавай дапамогай ужо накіраваны на месца.

Патрэбна тэрмінова вялікая дапамога. Чырвонакрыжная організацыя дзеля гэтай мэты ўжо адпусьціла сотні тысяч рублёў. Але каб хутка лівідаваць вынікі землятрасеньня патрэбны яшчэ вялізарныя сумы.

Шляхам збору сродкаў. ахвяраваньняў, адработкі на прадпрыемствах па некалькі гадзін на карысьць пацярпеўшых, пролетарская грамадзкасьць дапаможа чырвонакрыжнай організацыі справіцца з цяжкай і вялікай задачай, якая ўскладаецца на савецкі Чырвоны крыж.

Тэрмінова прыступім да збору сродкаў, накіраваўшы іх у распараджэньне Цэнтральнага к-ту Чырвонага Крыжу на бяг. рах. Дзяржбанку № 86-101591.

Усе як адзін на барацьбу з вынікамі землятрасеньня.

Брыгадзір ЦК Чырвонага Крыжу УССР Сямён Рубін

Паведамленьне

7-V—31 г., а 6 з паловай гадзіне ўвечары адбудзецца зьлёт Нач. Л. К. гор. Менску ў памяшканьні гаркому КСМ. Яўка абавязкова.

Штаб Л. К. г. Менску.
Нач. Штабу ЛК.

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.

Друкарня імя тав. Сталіна.

Галоўлітбел № 599.